№5 Об-05 40 260 3282



Старшыня Совета Народных Камісараў СССР і Народны Камісар замежных спраў
Вячэслаў Міхайлавіч Молатаў

АБ МІЖНАРОДНЫМ КОМУНІСТЫЧНЫМ ЖАНОЧЫМ ДНІ—8 САКАВІКА

ПАСТАНОВА ЦК ВКП(б)

Міжнародны Комуністычны жаночы дзень працоўныя нашай краіны святкуюць у 1940 годзе ў абстаноўцы новых перамог соцыялізма ў СССР, ва ўмовах велізарнага ўздыму палітычнай і вытворчай актыўнасці працоўных, далейшага ўмацавання маральна-палітычнага адзінства совецкага народа і яго згуртаванасці вакол большэвіцкай партыі.

Адным з выдатных вынікаў соцыялістычнага развіцця СССР з'яўляецца рост актыўнасці совецкіх жанчын ва ўсёй справе комуністычнага будаўніцтва.

З кожным годам расце роля жанчыны ў прамысловасці, у калгасах і соўгасах, ва ўстановах, на фронце культуры і навукі. За годы сталінскіх пяцігодак колькасць жанчын работніц і служачых павялічылася больш, чым у тры разы,—з 3 мільёнаў у 1929 годзе да 10,7 мільёна ў 1939 годзе, што складае 37,4 проц. усяго састава рабочых і служачых СССР.

Совецкія жанчыны з поспехам авалодваюць самымі складанымі прафесіямі і спецыяльнасцямі, раней даступнымі толькі мужчынам. На чыгуначным транспарце жанчыны працуюць машыністамі, у металургіі—сталяварамі, у вугальнай прамысловасці—машыністамі ўрубавых машын і т. д. Удзельная вага жанчын у буйнай прамысловасці Совецкага Саюза дасягнула 41,6 проц.

Жанчыны-калгасніцы з поспехам авалодваюць прафесіямі камбайнераў, трактарыстаў, механікаў, шофераў. Сярод механізатарскіх кадраў МТС у 1939 годзе працавала 60 тысяч жанчын. На курсах і ў школах трактарыстаў, камбайнераў і шофераў абучаецца зараз больш 100 тысяч жанчын-калгасніц.

Усесаюзная сельскагаспадарчая выстаўка асабліва наглядна паказала ролю жанчыны ў сельскай гаспадарцы. З 2.893 удзельнікаў выстаўкі, узнагароджаных Галоўным Камітэтам Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі вялікімі і малымі залатымі медалямі,—765 жанчын.

З кожным годам расце колькасць жанчын—інжынераў і тэхнікаў, навуковых работнікаў.

Дзесяткі тысяч совецкіх жанчын з поспехам працуюць на кіруючых пастах ва ўсіх галінах гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Сотні тысяч жанчын выбраны ў кіруючыя органы дзяржаўнай улады СССР. 1.625 жанчын з'яўляюцца дэпутатамі Вярхоўнага Совета СССР і Вярхоўных Советаў саюзных і аўтаномных рэспублік, больш 420 тысяч—дэпутатамі мясцовых советаў.

Ва ўсіх галінах соцыялістычнага будаўніцтва совецкія жанчыны прадстаўляюць велізарную сілу, сваімі гераічнымі справамі праслаўляючы нашу радзіму, умацоўваючы магутнасць соцыялістычнай дзяржавы.

Шырокі ўдзел прымаюць совецкія жанчыны ў соцыялістычным спаборніцтве імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі за выкананне ў чатыры гады заданняў пяцігадовага плана па росту прадукцыйнасці працы. З кожным днём растуць рады жанчын-стаханавак, многастаночніц. Усё шырэй робіцца круг перадавых совецкіх жанчын, узнагароджаных знакамі вышэйшага адрознення ў нашай краіне—ордэнамі Саюза ССР.

Совецкія жанчыны паказваюць узоры самаадданасці ва ўмацаванні абароны СССР і гераічнай абароны сваёй радзімы. Ужо нямала жанчын, узнагароджаных ордэнамі і медалямі Саюза ССР за ўзорнае выкананне баявых заданняў і праяўленыя пры гэтым доблесць і мужнасць.

Совецкі лад выхаваў новы тып жанчыны, якая паказвае ўзор комуністычнай свядомасці, беззаветна аддана сваёй радзіме і вялікай справе комунізма.

Шырокі ўдзел жанчын у вытворчым і грамадска-палітычным жыцці краіны магчым толькі ў краіне соцыялізма, дзе створаны для гэтага ўсе неабходныя ўмовы. Толькі ў СССР жанчыне створаны ўсе ўмовы для забяспечанага і шчаслівага мацярынства. Ні адна краіна ў свеце не мае такой прадуманай, разнастайнай сістэмы устаноў, якія дапамагаюць мацеры выхоўваць здаровых дзяцей: дамы адпачынку для цяжарных, дзіцячыя кансультацыі, яслі, малочныя кухні, дзіцячыя сады, дзіцячыя санаторыі, піонерлагеры. За апошнія 3 годы дзяржава адпусціла на дапамогу многадзетным мацерам звыш 3 мільярдаў рублёў.

ЦК ВКП(б) абавязвае партыйныя арганізацыі правесці Міжнародны Комуністычны жаночы дзень—8 сакавіка, як масавую палітычную кампанію, паказаўшы сусветна-гістарычнае значэнне вызвалення працоўных СССР ад капіталістычнага рабства, глыбокую розніцу паміж свабодным, поўнапраўным становішчам совецкай жанчыны, актыўнай будаўніцы комуністычнага грамадства і прыгнечаным становішчам жанчын у капіталістычных краінах.

Партыйныя, профсаюзныя і комсамольскія арганізацыі павінны дабіцца яшчэ большага ўцягнення жанчын у прамысловасць і транспарт, далейшага павышэння ролі жанчыны ў соцыялістычнай сельскай гаспадарцы, узначаліць рух совецкіх жанчын за аўладанне складанымі прафесіямі ў прамысловасці, транспарце і сельскай гаспадарцы, абароннымі і медыцынскімі спецыяльнасцямі. Неабходна ўзмацніць работу па вылучэнню перадавых жанчын і дзяўчат на кіруючыя пасты і пасады ў совецкіх, гаспадарчых і грамадскіх арганізацыях, уцягваючы лепшых беспартыйных жанчын, на справе даказаўшых сваю адданасць радзіме і справе будаўніцтва комунізма, у рады большэвіцкай партыі.

ЦК ВКП(б) указвае, што велізарны рост жаночай працы ў народнай гаспадарцы СССР па-

грабуе далейшага паляпшэння вытворчых і бытавых умоў жанчын, рашучага павышэння якасці работы дзіцячых і лячэбных устаноў, радзільных дамоў, прадпрыемстваў грамадскага харчавання, пральняў і т. д. Неабходна шырока прыцягваць да гэтай работы і да кантролю за выкананнем пастаноў партыі і ўрада па паляпшэнню вытворчых і бытавых умоў жанчын саміх працоўных жанчын і, у першую чаргу, жанчын—дэпутатаў советаў і шматлікі жаночы актыў грамадскіх арганізацый.

Памятаючы, што выхаванне дзяцей, нашага будучага пакалення, з'яўляецца адной з важнейшых задач жанчыны, партыйныя, совецкія, профсаюзныя і іншыя грамадскія арганізацыі павінны ўзмацніць клопаты аб жанчыне-маці, стварыць усе неабходныя ўмовы для таго, каб жанчыны-маці, разам са школай і комсамолам, прынялі яшчэ больш актыўны ўдзел у комуністычным выхаванні дзяцей.

Партыйныя арганізацыі павінны ўсямерна садзейнічаць далейшаму павышэнню ідэйна-палітычнага ўзроўню жанчын, росту іх комуністычнай свядомасці, палітычнай і вытворчай актыўнасці ў барацьбе за выкананне трэцяй сталінскай пяцігодкі, за далейшыя перамогі комунізма.

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ ВКП(б)

ВЕРНАМУ САРАТНІКУ ЛЕНІНА І СТАЛІНА— ВЯЧЭСЛАВУ МІХАЙЛАВІЧУ МОЛАТАВУ

Цэнтральны Камітэт большэвіцкай партыі горача вітае цябе, вернага саратніка Леніна і Сталіна, кіраўніка совецкага ўрада—у дзень твайго пяцідзесяцігоддзя.

Усё сваё свядомае жыццё ты безупынна служыш справе рабочага класа, справе комунізма ў якасці выдатнага дзеяча і правадыра большэвіцкай партыі. У чорныя годы рэакцыі пасля паражэння рэволюцыі 1905—1907 гг., у годы ўздыму рабочага руху, у эпоху «Звезды» і «Правды», у агні першай сусветнай імперыялістычнай вайны—ты заўсёды высока трымаў сцяг большэвізма, нястомна змагаючыся за дыктатуру пролетарыята ў нашай краіне. Як член Петраградскага Ваенна-рэволюцыйнага камітэта, ты правёў вялікую рэволюцыйна-большэвіцкую работу ў кастрычніку 1917 года. Сваёй работай ў якасці кіраўніка партыйных арганізацый Данбаса, Украіны, Масквы, у якасці сакратара ЦК ВКП(б), сваёй многагадовай слаўнай работай на пасту главы совецкага ўрада, ты заслужыў гарачую любоў і велізарную павагу партыі і працоўных Совецкага Саюза.

Як адзін з віднейшых правадыроў большэвіцкай партыі, як буйнейшы арганізатар соцыялістычнай эканомікі і новай, комуністычнай культуры, ты ўвасобіў у сабе лепшыя якасці палітычнага дзеяча ленінска-сталінскага тыпу. Ты заўсёды вёў і вядзеш паслядоўную барацьбу за ідэі марксізма-ленінізма, няўхільна адстойваючы лінію партыі супроць ворагаў партыі і совецкага народа, супроць трацкістаў, зіноўеўцаў, бухарынцаў і іншых агентаў буржуазіі.

Тваёй энергіі, тваёй нястомнай рабоце на пасту Старшыні Совета Народных Камісараў Саюза ССР краіна соцыялізма ва многім абавязана сваімі поспехамі і перамогамі. У сваіх вусных і друкаваных выступленнях перад партыяй і краінай ты абагульваеш гіганцкі вопыт вялікай работы па стварэнню комуністычнага грамадства.

Жадаем табе, наш дарагі друг і таварыш, ад усёй душы многіх, многіх год здароўя і далейшай пладатворнай работы на карысць нашай партыі, на карысць нашай радзімы, на карысць комунізма.

Цэнтральны Камітэт Усесаюзнай Комуністычнай Партыі (большэвікоў)

УКАЗ

ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР АБ УЗНАГАРОДЖАННІ СТАРШЫНІ СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ СССР ТАВАРЫША ВЯЧЭСЛАВА МІХАЙЛАВІЧА МОЛАТАВА ОРДЭНАМ ЛЕНІНА

За выдатныя заслугі ў справе арганізацыі большэвіцкай партыі, стварэння і умацавання совецкай дзяржавы ўзнагародзіць Старшыню Совета Народных Камісараў СССР таварыша Вячэслава Міхайлавіча МОЛАТАВА, у дзень яго пяцідзесяцігоддзя,—ордэнам ЛЕНІНА.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. Калінін.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. Горкін.

Масква, Крэмль,
8 сакавіка 1940 г.



На здымку: В. М. Молатаў і Н. С. Хрушчоў у прэзідыуме перадвыбарчага схода выбаршчыкаў Молатаўскай выбарчай акругі 8 снежня 1937 года у Калонным зале Дома Саюзаў. Фото Фішмана (фото-кліше ТАСС)

У гасцях у Вячэслава Міхайлавіча

У пачатку кастрычніка 1935 года нас з Вічугі выклікалі ў Маскву.

Гэта было ў самым пачатку стаханаўскага руху, а ў нашым тэкстыльным краі, Іванаўскай вобласці, ён разгараўся сярод ткачых. Мы ў сябе, у Вічузе, толькі што паставілі новы сусветны рэкорд—перайшлі працаваць на 144 станкі.

Прыехалі ў Маскву. Спачатку нас, стаханаўцаў лёгкай прамысловасці, сабралі ў Наркамаце, была нарада. Потым нам сказалі:

— Вас кліча да сябе ў госці таварыш Молатаў. У Крэмль, у Соўнарком.

Нам стала і радасна і боязна. Ці маглі мы калі-небудзь марыць, што нам—простым ткачыхам—давядзецца сустрэцца з главой совецкага ўрада, з бліжэйшым саратнікам вялікага Сталіна. Не толькі сустрэцца, але і расказваць яму аб сваіх справах, поспехах. Мы хваляваліся: а можа задасць такое пытанне, што мы не зможам адказаць? Мы разважалі: ці суровы, ці строгі ён чалавек?

З гэтымі думкамі мы ўвайшлі ў Крэмль. Нас сустрэлі як жаданых гасцей: былі накрыты сталы, было святочна, весела.

І раптам увайшоў таварыш Молатаў. Такі просты чалавек. Баязлівасці нашай як не бывала! Нас адразу пазнаёмілі. Мы і не заўважылі, як ужо ўключыліся ў агульную гутарку.

Але вось нас папрасілі расказаць аб тым, як мы дабіліся поспехаў. Мы зноў захваляваліся і гаворым:

— Мы-ж, таварыш Молатаў, не ўмеем выступаць.

А Вячэслаў Міхайлавіч сардэчна:

— Каго вы сароміцеся? Тут усе рабочыя, усе свае людзі і сароміцца няма каго. Проста раскажыце, як вы працуеце.

Пасля гэтых слоў нам стала добра. Мы адчулі сябе свабодна і пачалі расказваць.

Таварыш Молатаў падрабязна распытваў аб нашых рэкордах і цікавіўся гісторыяй гэтых рэкордаў.

— Ну, вось скажыце: вы самі дадумаліся да гэтага ці хто-небудзь вам прапанаваў узяць столькі станкоў?

— Не,—гаворым,—гэта мы самі вызваліся.

Тады таварыш Молатаў пачаў распытваць, хто нам у гэтай справе дапамагаў. Потым ён запытаў:

— А як рабочыя, ці ўсе задаволены стаханаўскім рухам, ніхто не крычыць на вас? І ці не перашкаджае хто вам?

Мы нават здзівіліся. Быццам таварыш Молатаў у гэтыя дні быў у Вічузе і ведае, што рабілася тады на нашай фабрыцы. У дакладнасці адгадаў. Было ўсё: і перашкаджалі нам спачатку і рабочыя некаторыя крычалі на нас. Моў, мы многа на сябе бяром і са справай не справімся. Мы расказалі аб усім таварышу Молатаву.

К канцу гутаркі мы настолькі звыкліся з таварышом Молатавым, гутарка наша цякла так лёгка, быццам мы знаёмы з ім цэлую вечнасць. Ён пытаў, як мы ўстроіліся ў Маскве, ці спадабалася сталіца.

Гутарка падыходзіла к канцу. Таварыш Молатаў развітаўся з намі.

— Жадаю вам усяго добрага,— сказаў ён.—Мабыць, у бліжэйшы час сустрэнемся.

Прайшло нямнога часу. 14 лістапада ў Вялікім Крэмлёўскім палацы адкрылася выдатная нарада стаханаўцаў прамысловасці і транспарта. Нас таксама выклікалі на гэту нараду. Мы сядзелі блізка ад прэзідыума, ад таварышоў Сталіна і Молатава. Таварыш Молатаў паказаў на нас таварышу Сталіну як на старых сваіх знаёмых:

— Вось ткачыхі Вінаградавы...

Пасля нарады стаханаўцаў, калі нас узнагароджвалі ордэнамі, таварыш Молатаў падышоў да нас. Ён падрабязна распытваў, як мы працуем, як адчуваем сябе. Мы расказалі Вячэславу Міхайлавічу аб нашых справах, сказалі, што цяпер працуем на 216 станках.

Мы часта атрымліваем пісьмы ад выбаршчыкаў. Прыходзіцца звяртацца да таварыша Молатава па дэпутацкіх справах для вырашэння розных пытанняў. І заўсёды мы знаходзім у таварыша Молатава вялікую ўвагу, патрэбны адказ і неабходнае падтрыманне.

ЕЎДАКІЯ ВІНАГРАДАВА,
ДЭПУТАТ ВЯРХОЎНАГА
СОВЕТА СССР.
МАРЫЯ ВІНАГРАДАВА,
ДЭПУТАТ ВЯРХОЎНАГА
СОВЕТА РСФСР.

ПАМЯЦІ Н. К. КРУПСКАЙ

Надзежда Канстанцінаўна Крупская належала да таго пакалення, якому прыходзілася ўступаць на арэну грамадскага жыцця ў другой палавіне васьмідзесятых гадоў мінулага стагоддзя. Гэта быў час самай жорсткай рэакцыі. Частка тагочаснай моладзі рэзка павярнула ўправа; рэволюцыйныя традыцыі «семідзесятнікаў», «клопаты аб меншым браце» былі адхілены. Гэтая моладзь думала толькі аб сваім асабістым добрабыце, аб сваёй кар'еры. Другая частка моладзі пад уплывам старэйшага пакалення, не ўсвядоміўшага прычын разгрому рэволюцыйнага руху, выкінула лозунг «малых спраў».

Перад Надзеждай Канстанцінаўнай стала пытанне: па якому шляху ісці?

Ёй здавалася, што на Вышэйшых жаночых курсах, якія ў той час адкрыліся, яна зможа знайсці адказ на мучыўшыя яе пытанні. Яна паступіла на гэтыя курсы. «Праз два месяцы я вельмі расчаравалася ў іх. Убачыла, што таго, што мне трэба, курсы мне не дадуць, што там вучаць вельмі вучоным рэчам, але вельмі далёкім ад жыцця». (Н. Крупская, «Маё жыццё», стар. 14.)

У той час у Пецербургу існавалі гурткі самаадукацыі. Надзежда Канстанцінаўна папала ў такі гурток, стала чытаць Маркса і, як яна сама потым гаварыла, «зразумела, што змяніць жыццё можа рабочы рэволюцыйны рух, што для таго, каб быць патрэбнай, карыснай, трэба аддаваць усе свае сілы рабочай справе». (Там-жа.)

Каб дабрацца да рабочых,—а гэта пры тагочасных паліцэйскіх умовах было вельмі цяжка,—Н. К. Крупская паступіла настаўніцай у нядзельную вячэрнюю школу ў с. Смаленскім, дзе яна прапрацавала пяць год. А калі ўзніклі соцыял-дэмакратычныя гурткі, у якіх вывучаўся марксізм, Надзежда Канстанцінаўна ўступіла туды. Каля трох год працавала ўжо ў гэтых гуртках Надзежда Канстанцінаўна, калі ў Пецербург прыехаў Владзімір Ільіч.

Прыезд Леніна ў Пецербург адразу адбіўся на ўсім рабочым руху. Разрозненыя марксісцкія гурткі былі аб'еднаны. Узнік «Саюз барацьбы за вызваленне рабочага класа». Побач з прапагандай у гуртках Ленін высунуў пытанне аб масавай агітацыі. Складаліся і друкаваліся лістоўкі.

Сярод членаў «Саюза» Надзежда Канстанцінаўна была ад-

ной з актыўнейшых. Калі ўзнікла небяспека арышту Леніна і іншых і стала пытанне аб захаванні сувязей у выпадку арыштаў, то «наследніцай», як тады называлі, падпольнай работы і сувязі з рабочымі была намечана Надзежда Канстанцінаўна.

Спакойная, вытрыманая, усвоіўшая ўсе правілы канспірацыі, яна пасля арышту Леніна ўстанавіла з ім сувязь, атрымліваемыя ад яго канспіратыўным шляхам пракламацыі здавала ў падпольную друкарню, не спыняючы ў той-жа час падпольнай работы сярод рабочых. Рэзультаты гэтай работы былі па таму часу велізарны. Надзеждзе Канстанцінаўне разам з таварышамі, якія асталіся на волі, удалося арганізаваць настолькі ўнушальную забастоўку пецербургскіх тэкстыльшчыкаў, што ўрад вымушан быў для супакаення рабочых выдаць законы аб ахове працы жанчын і аб рабочым дні... Але адначасова арганізатары забастоўкі, і ў першую чаргу Надзежда Канстанцінаўна, былі арыштаваны.

Сем месяцаў прасядзела Надзежда Канстанцінаўна ў турме. Яе павінны былі адправіць у ссылку ва Уфімскую губерню, але ёй удалося дабіцца дазволу адбываць ссылку ў с. Шушэнскім, куды саслалі Леніна.

Царскае самадзяржаўе ізаляцыяй рэволюцыянераў ад масы прабавала аслабіць рабочы рух. Тупы і абмежаваны царызм не разумеў, што такіх дзеячоў, як Ленін нельга адарваць ад рабочага рэволюцыйнага руху. З далёкай ссылкі па ініцыятыве Леніна і пад яго кіраўніцтвам быў складзен калектыўны пратэст супроць апартуністычнага «Крэда»; у ссылцы Ленін працаваў над «Развіццём капіталізма ў Расіі»; у ссылцы Надзежда Канстанцінаўна напісала работу «Жанчына-работніца»; нарэшце, ў ссылцы Ленін абмяркоўваў з Надзеждай Канстанцінаўнай планы арганізацыі за граніцай агульнарускай газеты рэволюцыйных марксістаў. То была потым створаная Леніным славутая «Искра», у ёй Надзежда Канстанцінаўна была сакратаром, вяла перапіску з шматлікімі падпольнымі гуркамі, якія Ленін еднаў у цэнтралізаваную партыю. Такую-ж работу Надзежда Канстанцінаўна вяла і ў газеце «Вперед».

Яшчэ ў годы падполля і эміграцыі Надзежда Канстанцінаўна глыбока вывучала пытанні народнай асветы, многа і пладатворна працавала ў галіне міжнароднага жаночага комуністычнага руху. Пасля перамогі Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі Надзежда Канстанцінаўна, старая настаўніца рабочых школ, старэйшая большэвічка, цалкам аддаецца барацьбе за культуру, за народную асвету. Яна становіцца членам калегіі, а затым намеснікам народнага камісара асветы.

Смяртэльна хворая, яна прадаўжала думаць аб партыі, аб прадстаячым XVIII з'ездзе, прасіла ўрачоў паскорыць лячэнне, каб яна магла ўдзельнічаць у гэтым вялікім з'ездзе. Але на гэты раз яе не ўдалося выратаваць.

Год таму назад, 27 лютага, напярэдадні XVIII партз'езда, перастала біцца сэрца вялікай тружаніцы, прысвяціўшай усё жыццё справе народа. Але памяць аб Надзежде Канстанцінаўне не памрэ, вобраз яе жыве ў сэрцах працоўных, якія захаваюць памяць аб ёй.

Фелікс Кон.

ГІСТАРЫЧНАЯ ДАТА

Працоўныя Заходніх абласцей БССР рыхтуюцца да гістарычнай даты—дня выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. На многалюдных сходах фабрык, заводаў, у вёсках, дзе абмеркоўвалася пытанне аб вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўных Советаў СССР і БССР, выступаючыя прамоўцы ад імя усіх працоўных выказвалі сваю глыбокую любоў да радзімы, да вялікай партыі большэвікоў, да таварыша Сталіна.

Шэсць месяцаў прайшло з таго часу, як доблесная Чырвоная Армія вызваліла рабочых і сялян Заходняй Беларусі ад іга капіталістаў і памешчыкаў. З гэтага дня для працоўных пачалося новае, светлае жыццё. Няма больш гнусных здзекаў над працоўнымі з боку драпежнікаў—памешчыкаў, фабрыкантаў, паліцэйскіх. Разам з гэтым канулі ў вечнасць рабства, эксплаатацыя і нацыянальны прыгнёт.

Яшчэ свежы ў памяці працоўных вялікія дні падрыхтоўкі і правядзення Народнага Сабрання. Яшчэ тады рабочыя і работніцы, сяляне і сялянкі жылі адной думкай: як-бы хутчэй устанавіць Совецкую ўладу, як-бы хутчэй з'еднацца са сваім адзінакроўным беларускім народам, уліцца ў брацкую сям'ю народаў Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік. Лёс быў вырашан. З таго часу прайшло не так ўжо многа, а якія нябачаныя змены адбыліся ў жыцці працоўных Заходніх абласцей БССР.

Жанчыны, у мінулым прыгнечаныя, цяпер актыўна ўдзельнічаюць у соцыялістычным будаўніцтве. Дзеці рабочых і сялян атрымалі права на асвету. Для маленькіх грамадзян пабудаваны дзіцячыя яслі, сады. Спакойная за сваіх дзяцей маці ідзе на работу на соцыялістычнае прадпрыемства,—Сталінская Канстытуцыя забяспечыла ёй права на працу, на вучобу і адпачынак.

Вось чаму з такім палітычным уздымам праходзіла вылучэнне кандыдатур у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР і БССР. Вылучаныя кандыдаты з'яўляюцца вернымі сынамі і дочкамі нашай радзімы. Яны выхадцы з самых гушч народных мас. Яны гатовы аддаць усе свае сілы і нават жыццё за працоўных, за радзіму, за вялікую справу Леніна—Сталіна.

На сходзе рабочых Масткоўскага лесапільнага завода вылучылі кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР Ніну Грыгораўну Стому—падсобную работніцу гэтага-ж завода. Былая батрачка Соф'я Несцераўна Юхімук—старшыня мясцкома чыгуначнай станцыі. Яе кандыдатура балатыруецца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР па Жабінскай выбарчай акрузе.

Жанчыну—сялянку ў былой панскай Польшчы лічылі самай нізкай істотай. Яна была пазбаўлена магчымасці вучыцца, не карысталася ніякімі правамі. І вось цяпер, толькі пасля ўстанаўлення Совецкай улады жанчыны роўнапраўныя грамадзянкі Совецкага Саюза. Яны карыстаюцца ўсімі правамі самай дэмакратычнай у свеце Сталінскай Канстытуцыі. Яны маюць права выбіраць і быць абранымі. Некалькі дзесяткаў сялянак вылучаны кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўных Советаў СССР і БССР.

Сярод іх Марыя Ларыёнаўна Капытава, патомсцвенная батрачка. Яна балатыруецца па Дзерэчанскай выбарчай акрузе ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. Батрачка Ольга Васільеўна Тарасюк вылучана кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. Бяднячкі—сялянкі Ольга Кірылаўна Мазалеўская (Беластоцкая абласць) і многія другія вылучаны кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

Працоўныя аказалі вялікае давер'е вылучыўшы іх кандыдатуры ў соцыялістычны парламент і гэта давер'е яны з гонарам будуць апраўдваць.

Для працоўных жанчын Заходніх абласцей БССР наступіла новая бліскучая эра. Эра, якая разбудзіла ў іх творчы энтузіязм, уцягнула іх у палітычнае і грамадскае жыццё краіны.

Выдатнейшы актыў з работніц, сялянак, перадавой інтэлігенцыі працуюць агітатарамі і членамі камісій на выбарчых участках. Гэтыя людзі даходчывымі словамі растлумачваюць выбаршчыкам выбарчы закон Совецкага Саюза, вывучаюць з імі Сталінскую Канстытуцыю, даводзяць да свядомасці мас грандыёзныя перамогі краіны соцыялізма за годы існавання совецкай улады.

Асабліва добра праявілі сябе агітатары Чэрнакова, работніца соцыяльнага забеспячэння горада Беластока, Яворская—загадчык клубам скурзавода, Цыгельніцкая з абласнога саюза медсанпрацы, Фрунке—работніца трэцяга тэкстыльнага камбіната (Беласток), Сідранская і Амсцібаўская (Валкавыск). Усе яны лепшыя агітатары, якія нясуць палкую большэвіцкую праўду ў гушчу мас, праводзяць актыўную агітацыйную работу за кандыдатаў непераможнага Сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

24 сакавіка—вялікае гістарычнае свята. У гэты дзень выбаршчыкі Заходніх абласцей БССР, усе як адзін, прыдуць на выбарчыя ўчасткі і аддадуць свае галасы за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных. Гэтым яны яшчэ раз прадэманстрыруюць перад усім светам сваю бязмежную любоў да вялікай непераможнай радзімы—СССР, да партыі Леніна—Сталіна, да любімага друга, бацькі і настаўніка ўсіх працоўных Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна.

Дэпутат народа

З 9 год Зоя Скобля пасла панскія каровы. А ўжо 12-гадовай дзяўчынкай яна пайшла на палявыя работы да памешчыка Змігародскага. Выконвала цяжкія і непасільныя работы, але з гэтым ні сам пан, ні яго прыслужнікі не хацелі лічыцца. Нават адпачыць раз у нядзелю не давалі.

— Аднойчы на прызьбе, каля хаты дзеда Гаўрылы, сабраліся вясковыя дзяўчаты і хлопцы,— расказвае тав. Скобля.—Непадалёку ад нас стаяў адзін незнаёмы з аднасельчанкай Надзяй Гіроўскай. Ён ёй расказваў аб тым, што ён чуў па радыё з Совецкага Саюза аб грандыёзным будаўніцтве, якое там праводзіцца. Непрыкметна яны падышлі да сабраўшыхся. Тут размова прыняла большы размах. Дзяўчаты, юнакі хутка акружылі незнаёмца і пачалі падрабязна распытваць, што ён чуў па радыё з Масквы. Ён многа гаварыў, як трэба весці барацьбу з капіталістамі і памешчыкамі. І вось адкуль ні вазьміся з'явіўся ўпраўляючы маёнткам і закрычаў як і заўсёды:

— Ах вы, гультаі, нядзелю святкуеце? А ну, марш гаспадарскі лён збіраць. Дзяўчаты кінулі ўсё і пабеглі выконваць загад. Працавалі цэлы дзень, але за работу нам не заплацілі таму, што мы збіраліся ў гэты дзень адпачыць.

Жыццё Зоі не змянілася і пасля таго, як яна вышла замуж. Доўгія годы з мужам Міхаілам хадзіла сячы дровы ў лес для памешчыкаў і асаднікаў.

У Зоі было трое маленькіх дзяцей. Трэба было паспець накарміць іх, а потым спяшацца на работу. Панскі слуга—ляснічы Бузоўскі неаднаразова праганяў Зою з работы за спазненне.

Яшчэ большае гора ахапіла Зою ў сувязі са смерцю мужа. Увесь цяжар лёг на яе плечы. Вельмі цяжка было ёй пражыць на двух гектарах апустошанай зямлі. Цяглавай сілы не было. насення для пасеваў не хапала. Часамі яна плакала, праклінаючы жыццё. Яна многа марыла пра лепшую долю, цікавілася жыццём працоўных Совецкага Саюза, пра якое так многа чула.

17 верасня 1939 г., калі Чырвоная Армія вызваліла народы Заходняй Беларусі, Зоі радасці не было канца. Ёй не верылася, што шчасце, аб якім яна столькі марыла, прышло. Дзень вызвалення астаўся ў яе памяці, як пачатак вялікага сапраўднага чалавечага шчасця.

З. Т. Скобля.

У тыя дні, калі вырашалася пытанне аб ўстанаўленні ўлады, сяляне Кашалеўскай воласці аказалі Зоі вялікае давер'е—паслалі яе дэпутатам у Народнае Сабранне.

Зоя Канстанцінаўна вельмі хвалявалася. Пры панскай-жа ўладзе не магло быць, каб батрачку выбралі ў органы ўлады, каб ёй даверылі рашаць лёс народа, а цяпер на яе долю выпаў вялікі гонар—яна член Поўнамоцнай Камісіі Народнага Сабрання Заходняй Беларусі. Яна чакала той мінуты, калі іх поезд адправіцца на Маскву.

... Поезд імчаўся па шырокім чыгуначным палатне ад Негарэлага да Масквы. Зоя разам з усімі членамі Поўнамоцнай Камісіі ўвесь час глядзела ў вакно. Перад яе вачыма прабягалі гарады, фабрыкі, заводы, калгасы, соўгасы соцыялістычнай дзяржавы.

Масква. Крэмль... Пятая Унечарговая Сесія Вярхоўнага Совета СССР. Зоя Канстанцінаўна бачыла тварца самай дэмакратычнай у свеце Канстытуцыі—Вялікага Сталіна. Радасці яе не было граніц.

Усё, што бачыла Зоя ў Маскве, наўрад ці згладзіцца калінебудзь з яе памяці. З вялікімі ўражаннямі вярталася яна дамоў. На сходах выбаршчыкаў расказвала, што яна бачыла ў Маскве, у цудоўнай краіне соцыялізма, расказвала аб заможным жыцці калгаснікаў, аб шчаслівай совецкай дзетвары.

— Заходзім мы ў мінскі Палац піянераў і окцябрат,—гаворыць тав. Скобля.—Гэта казачны палац. Тут дзеці майструюць розныя мадэлі складанейшых машын, чытаюць кнігі, танцуюць, спяваюць.

Змянілася цяпер і жыццё Зоі Канстанцінаўны. Яна атрымала зямлю. Ліквідавала непісьменнасць. Навучылася чытаць і пісаць, скончыла курсы агітатараў.

На перадвыбарчы сход сабраліся працоўныя вёсак Кашалеўскай воласці. На парадку дня стаяла адно пытанне—вылучыць кандыдатаў у дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета. Слова ўзяў селянін Наумовіч Міхаіл.

— Я прапаную, — гаворыць ён,—вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР батрачку, верную дачку народа Зою Канстанцінаўну Скоблю.

Прапанова была сустрэта з вялікім адабрэннем.

Акруговая камісія зарэгістравала кандыдатуру тав. Скоблі для балатыравання ў дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР па Новагрудскай выбарчай акрузе № 608.

24 сакавіка ўсе выбаршчыкі Новагрудскай выбарчай акругі прыдуць на выбарчыя ўчасткі, каб аддаць свае галасы за дастойную дачку народа.

П. Музычэнка.

г. Баранавічы.

Кандыдат у дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР па Жабінскай выбарчай акрузе № 603 Софья Несцераўна Юхімук—былая батрачка, цяпер вылучана на работу старшыні мясцкома чыгуначнай станцыі Жабінка.

Фото В. Лупейка і В. Марціонко (Фотахроніка БЕЛТА)

Кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па Гарадзейскай выбарчай акрузе № 282 Феціння Аляксееўна Ладзято—сялянка-бяднячка вёскі Козлы, Несвіжскага раёна, Баранавіцкай вобласці.

Фото Б. Вернера (Фотахроніка БЕЛТА)

Кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па Давід-Гарадокскай гарадской выбарчай акрузе № 471 Елена Грыгорьеўна Місюра—работніца Давід-Гарадокскага скуранога завода.

Фото І. Шышко (Фотахроніка БЕЛТА)

Марыя Нікалаеўна Чэрнік

На трыбуне—простая беларуская сялянка Марыя Нікалаеўна Чэрнік з вёскі Белы Бераг, Юрацішскага раёна, Баранавіцкай вобласці. Народ вылучыў яе кандыдатам у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР. Яна расказвае аб сваім жыцці. Слухаеш яе расказ і ўспамінаецца паэма Янкі Купалы «Зімою», у якой ён апісвае няшчаснае жыццё батрачкі Ганны. Нібы пра дзяцінства Марыі Нікалаеўны напісаны радкі:

Ты помніш, як маці цябе твая
родная
Дзень першы ў лапці абула,
Як ты, падрастаючы, цвёрдую,
зрэбную
Кашулю на целе пачула.
Галела, калела ў полі ты, з
пугаю,
Куску жадна будучы хлеба,
Па лесе, на пасецы з стадам
цягалася,
Патолі не знала ад неба.

Марыя Нікалаеўна не помніць, ці абувала яе калі маці: ёй не было яшчэ году, як яна засталася сіратой.

Горкі мачыхін хлеб. У пяць год Марыля стала зарабляць яго сваёй працай. Яна гнала ў поле жывёлу, скорчыўшыся, пераступаючы босымі нагамі, стаяла пад ялінкай або бегла за авечкамі, не пускаючы іх на жытнюю рунь. У гарачую спёку яна калыхала у полі мачыхіных дзяцей, ходзячы па колкім іржышчы, складала ў копны снапы, палола грады, а ўвосень капала бульбу і пальцы яе стылі ад холаду.

Калі ёй споўнілася дзесяць год, пачалася вайна, бацьку пагналі на фронт, праз іх вёску пайшлі натоўпы бежанцаў. Разам з імі, баючыся адстаць ад мачыхі, пайшла і Марылька, шукаючы спакайнейшага прытулку на зямлі.

Пяць год блукала яна па розных гарадах і сёлах, нічога не ведаючы пра бацьку. Калі-ж скончылася вайна і ён прыехаў да іх, яна не пазнала яго: хворы, скалечаны, ён быў падобны на цень. Марыля працавала служанкай у чайной. Хутка бацька памёр. Марыля асталася круглай сіратой. Разам з мачыхай яна паехала да яе радні—у вёску Пацавічы, Бакштанскай воласці. Каб пазбавіцца ад лішняга роту, мачыха выдала яе замуж ў вёску Белы Бераг за Лукаша Чэрніка. Марылі не было тады і шаснаццаці год. Сям'я мужа была беднай,—пяць дзесяцін зямлі на трох братоў. Свякруха спадзявалася на багатую нявестку. Марыля-ж прышла, у чым была: без кажухоў і абрусоў, без намётак і ручнікоў.

— Беспасажніца... Жабрачка... са злосцю гаварыла пра яе свякруха.—У чым нарадзілася—у тым і жанілася... Прышла аб'ядаць нас... У нявесткі кавалак хлеба перасядаў у горле, пачуццё горкай крыўды мучыла сэрца.

Пяць год пражыла яна ў свякрухіным пекле. А потым угаварыла мужа аддзяліцца. Далі ім паўтары дзесяціны зямлі і куток у хаце. Траціна ў полі, траціна ў гумне траціна ў печы—зноў сваркі і лаянкі. Калі-ж памёр мужаў брат, пачаліся суды-перасуды за яго частку «спадчыны»—паўтары дзесяціны зямлі. Муж патрабаваў раздзяліць братаву долю папалам, а Марылін свёкар, яго бацька, адмаўляўся, пакідаючы зямлю за сабой. Так судзіліся некалькі год. Бацька і сын сталі паміж сабой ворагамі. Родная маці праклінала свайго сына і сваіх унукаў—Міколу,

Валодзьку, Лявона і ўсяму віной—тонкі шнур пясчанай зямлі, на якім цяжка праехаць з бараной, вузейшы за панскую мяжу паміж землямі двух маёнткаў...

Верасень 1939 года. Прышла радасная вестка аб пераходзе граніцы Чырвонай Арміяй. Марыя Нікалаеўна пачула яе ад старэйшага сына Міколы. Прышоўшы дамоў, ён дрыжачым голасам праказаў:

— Мама, радасць нам: таварышы ідуць!

Усхваляваная да глыбіні, Марыя Нікалаеўна ўсклікнула:

— Ціха, сынок, нікому не кажы!.. Калі няпраўда, будуць нас цягаць...

А сама ведала, сэрцам адчувала—праўда, святая праўда: Чырвоная Армія нясе ёй і яе дзецям вызваленне і шчасце.

... Перапалоханы пан загадаў парабку Чэсю ўмомант прыгнаць коней з лугу. Парабак сказаў аб гэтым сялянам. Яны прышлі да пана і абязброілі яго. У пана знайшлі тры вінтоўкі. Ён збіраўся захапіць іх з сабой, каб супраціўляцца. Сярод сялян, абязбройваўшых пана, быў і Мар'ін сын Мікола.

Сама Марыя Нікалаеўна таксама рыхтавалася да сустрэчы Чырвонай Арміі. Яна дастала з куфра самую лепшую сваю хустку, чырвоную, у якой хадзіла на кірмашы ў Юрацішкі і разарвала яе на вузкія каснікі. Падышоўшы да народа, які чакаў Чырвоную Армію, яна раздзяліла іх паміж людзьмі.

Узрадаваныя людзі з чырвонымі каснікамі ў руках пабеглі на валожынскі тракт, на якім паказалася чырвонае войска. Са слязьмі на вачах сустракалі яны сваіх вызваліцеляў ад панскай няволі.

Тры дні прастаяла Марыя Чэрнік ля дарогі з Валожына ў Бакшты, па якой ішлі танкі і пяхота. Яна глядзела на дарагія, родныя твары чырвонаармейцаў і плакала ад радасці.

— Чаго плачаш?—пыталіся ў яе байцы.

— Ад шчасця, таварышы, плачу,—адказала яна.—Пачула сваю родную мову, убачыла сваіх братоў-збавіцеляў.

Босая, яна стаяла з боку дарогі і не зводзіла вачэй з грамыхаючых танкаў і гармат, галопам скачучай конніцы, маршыруючай пяхоты.

У Белым Беразе настала новае жыццё—без паноў і жандармаў. Старэйшы сын Марыі Нікалаеўны паступіў у народную міліцыю, сярэдні пайшоў вучыцца ў пяты клас школы, меншы—у другі клас. Марыя Нікалаеўна працавала членам выбарчай камісіі па выбарах у Народнае Сабранне. Калі-ж пачалося вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўных Советаў СССР і БССР, сяляне і сялянкі Белага Берага вылучылі сваю зямлячку дэпутатам Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР.

Скончыліся, адыйшлі ў нябыт часы няволі і пакут. Марыя была беспасажніцай, жабрачкай, рабыняй. Сёння—яна свабодная грамадзянка Краіны Советаў будзе дзяржаўным дзеячом.

— Пасаг мой цяпер—уся совецкая зямля ад края да края,—гаворыць Марыя Нікалаеўна.—А хіба я магла думаць і марыць раней, што стану вядомым чалавекам і мяне будуць выбіраць у Соцыялістычны Парламент? Паны і падпанкі выбіралі адзін аднаго. А цяпер для нас шчасце прышло. Абяцаю сялянам, што не пашкадую жыцця для народа, для Чырвонай Арміі і для свайго роднага бацькі—мудрага Сталіна.

Такі шлях простай беларускай сялянкі, якая будзе дастойным дзяржаўным дзеячом.

Ц. Зарэчны.

Стоўбцы.

Сустрэча выбаршчыкаў з кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па 274 Баранавіцкай выбарчай акрузе Брохай Іосіфаўнай Гуталевіч.

Фото Л. Мазэлева.

Сакратар партыйнай арганізацыі ордэнаноснага калгаса імені БАВА (Любаньскі раён, Мінскай вобласці) Н. І. Галай гутарыць з брыгадзірамі паляводчых брыгад—кандыдатамі на Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку 1940 года камсамольцамі, якія падалі заявы аб прыёме ў рады партыі. Злева направа: О. Ф. Кулакоўская, Н. І. Галай, А. Ё. Чэркас і Е. І. Хамніцкая.
Фота М. Савіна (Фотахроніка БЕЛТА)

Група перадавікоў сельскай гаспадаркі Магілёўскага раёна. Злева направа: даярка калгаса „Чырвоны пераменнік" Н. А. Рыўкова, цялятніца калгаса імені Дзімітрава С. А. Зубікава і звеннявая па кок-сагызу калгаса „Чырвоная зорка" А. Т. Раманава.
Фота А. Розэльмана (Фотахроніка БЕЛТА)

Дэпутат Віцебскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных, лепшая звеннявая па ільну калгаса імені Мікаяна (Талачынскі раён) Е. В. Шостак праводзіць заняткі са сваім звяном аб агратэхнічных мерапрыемствах, якія забяспечваюць атрыманне высокага ўраджаю ільна.
Фота Б. Хеніна (Фотахроніка БЕЛТА)

Кузніца спецыялістаў сельскай гаспадаркі

Школа механізатарскіх кадраў— гэта крыніца, адкуль сельская гаспадарка атрымлівае кваліфікаваных спецыялістаў для работы на шырокіх калгасных палях. У школе перадавая калгасная моладзь набывае веды, авалодвае складанымі сельскагаспадарчымі машынамі.

Смілавіцкая школа механізатарскіх кадраў сельскай гаспадаркі Мінскай вобласці арганізавалася ў 1938 годзе. І за першы навучальны год яна выпусціла 591 спецыяліста сельскай гаспадаркі. Тут пераквалiфікаваліся, паглыбілі свае веды, набылі іх уноў 104 камбайнеры, 47 памочнікаў камбайнераў, 152 шофера і 288 трактарыстаў.

Гэтыя людзі ў 1939 годзе працавалі ўжо на палях калгасаў. Яны па-стаханаўску змагаліся за выкананне пастаўленага перад усімі калгасамі, перад спецыялістамі сельскай гаспадаркі сталінскага задання—дабіцца ў Трэцяй пяцігодцы 8 мільярдаў пудоў зярна ў год.

Цяпер школа рыхтуе 100 камбайнераў, 25 машыністаў ільнаперабільных машын і таксама памочнікаў камбайнераў.

Адначасова Смілавіцкая школа павінна падрыхтаваць 25 камбайнераў і 50 трактарыстаў для работы на гусенічных трактарах для заходніх абласцей Беларусі.

Многія курсанты школы механізатараў маюць бліскучыя поспехі. Выдатнікі вучобы з групы камбайнераў з'яўляюцца тт. Капусцік, Макейчык, Жалезніцкая, з групы машыністаў ільнаперабільных машын—тав. Клюй.

Марыя Іванаўна Капусцік—трактарыстка, комсамолка, член комсамольскага камітэта школы. Яшчэ маладая дзяўчына. Увесь час працавала ў калгасе «Чырвоны спецыяліст», Сенніцкага сельсовета, Мінскага раёна. Уся яе сям'я і яна сама выдзялялася ў калгасе стаханаўскімі метадамі працы.

У канцы 1938 года Марыя Іванаўна паступіла на курсы трактарыстак пры Мінскай МТС. Па сканчэнні іх пачала працаваць у гэтай-жа МТС на трактары ХТЗ. За адзін сезон яна ўзарала 80 гектараў зямлі і засеяла радковай сеялкай 160 гектараў азімага жыта.

У першай групе камбайнераў яна з'яўляецца прыкладам для курсантаў. У спаборніцтве з курсантам гэтай-жа групы тав. Гурскім ідзе ўперадзе. Тав. Капусцік заяўляе, што яна будзе таксама выдатна працаваць як вучыцца.

Такую-ж задачу перад сабой ставіць і другая выдатніца вучобы Канстанціна Іванаўна Дарагуш.

— Працаваць выдатна,—гаворыць тав. Дарагуш,—гэта не толькі мая мара, але і абавязак. Выбаршчыкі з калгасаў «Чырвоная Беларусь», імені Дзмітрыева, «Пралетарый» аказалі мне вялікае даверʼе,—абралі дэпутатам Дзержынскага раённага Совета дэпутатаў працоўных. Гэта абавязвае мяне працаваць толькі па-стаханаўску.

Тав. Дарагуш трактарыстка. Цяпер займаецца ў групе камбайнераў. Яна вядзе велізарную агітацыйна-масавую работу сярод курсантаў школы. Да заняткаў у перапынках, а таксама ў інтэрнатах Канстанціна Іванаўна чытае матэрыялы з газет, журналаў. З асаблівым інтарэсам слухаюць курсанты кожнае слова аб гераічных подвігах доблеснай Чырвонай Арміі ў Фінляндыі. Яны рады, што авалодваюць такой ганаровай спецыяльнасцю. У мірны час яны будуць работаць на прасторных палях калгасаў, а ў ваенны час з чэсцю перасядуць з трактараў і камбайнаў на танкі і другія баявыя машыны і будуць у перадавых радах доблеснай Чырвонай Арміі пры абароне свяшчэннай совецкай зямлі.

Тут ёсць яшчэ выдатнікі вучобы тт. Макейчык і Клюй. Абедзве яны актыўна ўдзельнічаюць у друку.

Тав. Клюй—староста групы. Яна праводзіць вялікую работу па разгортванні соцыялістычнага спаборніцтва паміж курсантамі і групамі школы. Аднак нельга не астанавіцца на маючыхся недахопах у рабоце школы. Памяшканне школы вельмі цеснае і не абсталяванае. Няма дзе размясціць наглядныя дапаможнікі, дэталі. Настаўнікамі школа не даукамплектавана. Няма гаража для захавання машын.

Задачы перад школай механізацыі велізарныя. І яны з імі справяцца пры ўмове, калі ўсе маючыеся недахопы ў рабоце будуць ліквідаваны ў самы бліжэйшы час.

Н. Старавойтава.

Смілавічы.

У раённай агратэхнічнай лабараторыі (Лёзненскі раён, Віцебскай вобласці). На здымку: загадчыца лабараторыі тав. Старавойтава прымае ад укладаўшчыка калгаса «Камінтэрн» тав. Берэдова зярно на аналіз.
Фота Б. Хеніна (Фотахроніка БЕЛТА)



На здымку: агульны выгляд электрастанцыі калгаса „Перамога", Быстрынскага сельсовета, Копыльскага раёна.
Фота „Белсаюзфото"

ЗА ДРУЖНУЮ РАБОТУ Ў ШКОЛЕ

Совецкая дзетвара самая шчаслівая дзетвара ў свеце. Нідзе ні ў адной краіне дзецям не прадастаўлены такія магчымасці для вучобы і роста, як у нас, у Совецкай краіне. Аб выхаванні нашых дзяцей штодзённа клапоціцца партыя, урад і асабіста таварыш Сталін. У нашых школах навучаецца 35 мільёнаў совецкай дзетвары, а ў 1942 годзе лік навучаючыхся дасягне 40 мільёнаў

Самае каштоўнае, чым распалагае наша школа—гэта кадры настаўніцтва, любоўна выпеставаныя клапатлівай рукой большэвіцкай партыі і Совецкага Урада. На долю настаўніка выпала вялікая чэсць—фарміраваць комуністычны светапогляд нашага падрастаючага пакалення.

Але работа школы па выхаванню дзяцей можа быць толькі тады пладатворнай, калі ў гэтай справе прымуць удзел сям'я, бацькі, уся совецкая грамадскасць.

X Пленум ЦК ВЛКСМ у сваіх рашэннях вельмі ярка і выразна паказаў работу комсамола ў школе, асудзіў няправільныя адносіны комсамола к школе, абавязаў усе комсамольскія арганізацыі дапамагчы настаўніку ў яго пачотнай працы. X Пленум растлумачыў комсамольцам—школьнікам, што іх першачарговай задачай з'яўляецца—вучыцца добра і выдатна.

Між тым, ці можна спакойна прайсці міма такога факта, калі за першае паўгоддзе 1939—1940 навучальнага года 270 тысяч школьнікаў па рэспубліцы атрымалі дрэнныя адзнакі. Гэты факт павінен хваляваць усю грамадскасць.

Там, дзе дружная работа настаўніцкага калектыва, комсамольскай арганізацыі і бацькоў у школе, там і рэзультаты работы добрыя. Справа выхавання дзіцяці—гэта не прыватная, а дзяржаўная справа. Ёсць у нас многа бацькоў, якія часта наведваюць школу, раяцца з педагогам па пытанню выхавання дзяцей, яны ўнікаюць у работу школы і жывуць інтарэсамі яе.

Работніца швейнай фабрыкі «Кастрычнік» (Мінск) тав. Савіцкая мае пяць дзяцей. Муж яе быў на Фінляндскім фронце. Яна многа ўвагі ўдзяляе выхаванню сваіх дзяцей. Сочыць за іх паводзінамі і вучобай. Дзеці ў школу заўсёды прыходзяць чыстымі, акуратнымі. Сын яе Валодзя—вучань 3 класа 46 Мінскай школы вучыцца толькі на выдатна, дысцыпліна таксама выдатная. Не мае ніводнага пропуска і спазнення на заняткі.

Аднак на вялікі жаль мы маем яшчэ многа выпадкаў няправільных адносін бацькоў да выхавання сваіх дзяцей і да школы. Яны лічаць, што іх місія па выхаванню закончана пасля таго, як дзіцё пайшло ў школу, а потым школа павінна адказваць за паводзіны дзіцяці. Правільна, школа нясе адказнасць за выхаванне дзяцей. Галоўнае—даць веды вучням. Совецкая школа і настаўніцтва прызваны вырошчваць з іх усебакова развітых і адукаваных грамадзян. Але гэта не знімае адказнасці з бацькоў за сваіх дзяцей.

Зусім не праў тав. Дубоўскі, сын якога вучыцца ў 6 класе Мінскай 20 школы, калі ён не толькі сам не бывае ў школе, а нават не ласкава сустракае прадстаўнікоў школы, членаў бацькоўскага камітэта. Аднойчы, калі са школы звярнуліся да яго па пытанню дрэнных паводзін яго сына ў школе, ён адказаў: «Не перашкаджайце мне чытаць газету». А між тым сын тав. Дубоўскага перашкаджае вучыцца ўсяму класу і школе. Або тав. Гладштэйн—дачка якога займаецца ў 8 класе 46 школы г. Мінска, сказаў класнаму кіраўніку: «Я прымушу вас хадзіць да мяне кожную пяцідзёнку і дакладаць як мая дачка вучыцца. Я-ж да вас у школу хадзіць не намеран». Такіх бацькоў не так ужо многа, але тамсям такая безадказнасць праяўляецца. Гэта з'яўляецца зусім недапушчальным.

Па прыкладу схода калектыва рабочых і служачых завода «Серп і молат» горада Масквы на радзе прадпрыемстваў, калгасаў і соўгасаў нашай рэспублікі праведзены сходы па пытанню дапамогі школе ў выхаванні дзяцей. Так, калгас «Пролетарый», Круглянскага раёна, забяспечыў школу палівам, арганізаваў падвоз вучняў да школы. Рабочыя лесакамбіната горада Бабруйска на сходзе рашылі стварыць пры рабочым клубе дзіцячы сектар. Ужо пачалі працаваць струнны гурток, драматычны, харавы гурток.

Асобныя мацеры пайшлі ў школы, узяліся за кіраўніцтва гуркамі. Яны з мацярынскай любоўю адносяцца да сваіх гуркоўцаў. Так, тав. Бейлінсон арганізавала гурток рукадзелля, прыцягнула да гэтай справы вялікую колькасць вучняў. Вялікую дапамогу аказвае школе ў падрыхтоўцы да алімпіяды дзіцячай творчасці народны артыст рэспублікі тав. Владамірскі, і мастацкі кіраўнік тэатра юнага гледача тав. Міровіч. Віцебскае мастацкае вучылішча вылучыла 15 чалавек кіраўнікамі мастацкіх гуркоў для работы ў школах горада. Але пакуль яшчэ ў гэту пачотную работу ўключыліся толькі паасобныя таварышы.

Часта дзіцё прыходзіць да дому са школы задоўга да прыхода бацькоў з работы. Яно прадастаўлена само сабе. Ці-ж нельга пры клубах прадпрыемстваў, у жылых дамах арганізаваць дзіцячыя пакоі, дзе-б дзеці праводзілі свой вольны час.

Нельга не ўпамянуць такі факт, як адсеў вучняў са школы. У радзе раёнаў рэспублікі па школам налічваецца вялікі процант адсева вучняў. Няма ніякага апраўдання за такі правал. З практыкі работы некаторых школ відаць, што там, дзе з гэтай справай змагаюцца па-большэвіцку, там усе дзеці вучацца, няма адсеву.

Трэба штодзённа клапаціцца аб выхаванні нашага дзіцяці. В. І. Ленін вучыў: «Трэба, каб уся справа выхавання, асветы і вучэння сучаснай моладзі была выхаваннем у ёй комуністычнай маралі».

Чэрнікава—
сакратар ЦК ЛКСМБ.

З успамінаў

АБ АДНОЙ СТРАШНАЙ НОЧЫ

Каб з поўнай яскравасцю ўявіць сабе, як азвярэлая польская жандармерыя здзекавалася над жанчынамі не будзе лішнім расказаць аб адным з многіх эпізодаў майго жыцця.

Гэта было летам у вёсцы Ламашова, былой Слонімскай акругі. Позна ўначы мы праводзілі сход комсамольскай арганізацыі. Пасля схода разам са мной пайшоў адзін таварыш. Падышоўшы да ўскраіны вёскі, мой спадарожнік пайшоў уперад, каб паглядзець ці няма там каго-небудзь. Я астанавілася.

Доўга чакала таварыша, але ён не вярнуўся. Гэта выклікала ў мяне падазрэнне. Я зрабіла некалькі крокаў уперад, як раптам з-за будынка выбеглі двое паліцэйскіх і скамандавалі «рукі ўверх». Ведаючы, што адна з комсамолак схавалася ў гэтым будынку, я пачала ва ўвесь голас крычаць, каб яна пачула:

— Не крычыце. Я чую.

Яны-ж працягвалі ціханька даваць каманду:

— Спыніцеся.

А я прадаўжала крычаць:

— Не крычыце...

Як азвярэлыя драпежнікі паліцэйскія напалі на мяне, звязалі і павезлі ў поле. Гнусныя мярзотнікі білі мяне нагайкамі, шампаламі, здзекваліся фізічна і маральна.

Калі я была ўжо ў беспрытомнасці, яны зноў скавалі мяне ў ланцугі і, прывязаўшы ногі да воза, уніз галавой— везлі да Слоніма, куды мы прыехалі на досвітку.

У дэфензіве катаванні і здзекі былі яшчэ большымі. Лютасці панскіх галаварэзаў не было канца. Спачатку мяне білі палкамі, потым прыкладамі і нарэшце пыталі электрычным токам.

Увесь час, на працягу ўсёй ночы, я сябе трымала стойка, мужна. Аднак пасля электрычных пытак я не вытрымала і заплакала. Словамі нельга перадаць жудасных здзекаў, якія я перанесла за гэту ноч. Але чым больш мяне мучылі і здзекваліся, тым больш я была непахіснай.

Пасля электрычных пытак мяне кінулі ў турэмную камеру і туды ўпусцілі звар'яцелага. Сабраўшы ўсе сілы я схапіла табурэтку і пачала яго біць. І толькі тады, калі пачула гэта ахранка, яго забралі.

У турме я перанесла не толькі ўсе здзекі, але нагледзелася на невыноснае гора мацярэй і дзяцей, якія разам са мной сядзелі. Адзін выпадак, які мне вельмі добра запомніўся, наступны.

Сялянку—маці шасцярых дзяцей пасадзілі ў турму за тое, што яна сеяла табаку. Часта яна сябе суцяшала тым, што дома з дзецьмі астаўся муж. Але якім вялікім было яе гора, калі яна ўбачыла ў турэмных засценках і свайго мужа. Дзень і ноч гэта сялянка горка плакала, яна рвала на сабе валасы, білася аб каменную сцяну. Яе мукам не было граніц.

Кулакі сціскаліся ў зняволенных, хто бачыў гэту трагічную сцэну. Ім хацелася кінуцца на звярыную стаю польскіх заправіл і іх прыслужнікаў, зубамі перагрызці ім глоткі, рваць іх цела на кавалкі, здзекавацца над імі так, як яны здзекваліся над працоўным народам.

Вялікі час прышоў. Доблесная Чырвоная Армія вызваліла нас—працоўных. Мы зараз радасныя і шчаслівыя грамадзяне. Я, раней двойчы кіданая польскай ахранкай у турму за тое, што вучыла працоўных шукаць праўды ў жыцці, зараз як і дзесяткі тысяч другіх жанчын, працую на соцыялістычным прадпрыемстве—вылучана загадчыкам аддзела кадраў вялікага тэкстыльнага камбіната № 1. На маіх вачах расце калектыў, завод.

У першы час на камбінаце працавала 700 чалавек. Цяпер у нас ужо 1498 рабочых і работніц выпускаюць совецкую прадукцыю. Адна з страшных начэй, аб якой я тут расказала, здаецца мне сном і гэта таму, што зараз я жыву ў Вялікім Совецкім Саюзе, дзе жыццё асвятляецца праменнямі Сталінскай Канстытуцыі.

Зіна Клейф—загадчык аддзела кадраў тэкстыльнага камбіната № 1.

У доме былога памешчыка—заводчыка Столле, Лідскім уездным аддзелам аховы здароўя адкрыта бальніца на 40 ложак для рабочых шклозавода „Неман" і сялян бліжэйшых вёсак. Пры бальніцы адкрыта радзільнае аддзяленне. На здымку: акушэрка С. С. Карпава прыносіць жонцы рабочага шклозавода Пілко Ю. І., нованароджаную дачку.

Фота Б. Вернера (Фотахроніка БЕЛТА)

АКТЫЎНАСЦЬ

Пры панаванні белапольскай зграі ў заходніх абласцях БССР працоўная жанчына не магла нават і марыць аб тым, што яна зможа займаць пасаду нароўні з мужчынай і прымаць удзел у палітычным жыцці.

Совецкая ўлада змяніла становішча калісьці загнаных бяспраўных жанчын. Цяпер яны з'яўляюцца актыўнымі будаўнікамі соцыялізма, адданымі агітатарамі большэвіцкага слова.

Цяпер тут ідзе вялікая крапатлівая работа па перавыхаванні людзей у духу комунізма. Працоўныя, асабліва жанчыны, з вялікім імкненнем і ўвагай ловяць кожнае большэвіцкае слова. Няма той галіны работы, дзе-б жанчына не прымала актыўнага ўдзелу.

У трыкатажнай - арцелі, дзе працуе 150 жанчын, 85 чалавек вывучаюць рускую мову. Там арганізаван жаночы хор з 75 чалавек, які ў міжнародны комуністычны жаночы дзень—8 сакавіка паказаў працоўным горада сваю самадзейнасць. Вера Кузаўка—былая беспрацоўная, цяпер лепшая актывістка арцелі, з'яўляецца старшынёй культсовета, старшынёй ячэйкі МОПР і членам бытавога сектара. Карыстаецца вялікім аўтарытэтам сярод работніц. На гарадской алімпіядзе была прэміравана за лепшую дэкламацыю.

Баршчэўская Станіслава Леонаўна былая тэлефаністка вылучана начальнікам тэлеграфа на чыгунцы.

Цяпер перад партыйнымі, совецкімі, профсаюзнымі і грамадскімі арганізацыямі стаіць ганаровая і адказная задача—падрыхтаваць людзей да выбараў і правесці выбары на высокім палітычным узроўні.

Для правядзення гэтай адказнай работы мы маем актыў з лепшых жанчын—актывістак, якія прымалі ўдзел у выбарах дэпутатаў Народнага Сабрання Заходняй Беларусі. Ёсць нямала маладых актывістак, якія вылучаны членамі ўчастковых камісій. Нядаўна пры Брэсцкім гаркоме партыі працавалі курсы агітатараў, з іх палова жанчын.

Лепшая актывістка Маша Файншмід—стаханаўка трыкатажнай арцелі прымала актыўны ўдзел у выбарах Народнага Сабрання. Яна скончыла курсы агітатараў і з вялікім гонарам праводзіць заняткі па вывучэнню самай дэмакратычнай у свеце Сталінскай Канстытуцыі і выбарчага закона. Маша Файншмід рыхтуецца ўступіць ў рады Ленінскага комсамола—гэта яе заветная мара.

Дапамагчы раней прыгнечанай жанчыне ў набыцці ведаў, узняць яе да ўзроўню перадавой совецкай жанчыны—гэта абавязак кожнага партыйнага і беспартыйнага большэвіка.

Радкевіч—інструктар гаркома партыі.

Брэст.

ВЕРЫЛІ Ў ЛЕПШУЮ БУДУЧЫНЮ

Працоўныя масы Заходняй Беларусі і Украіны будуць вякамі памятаць гістарычную дату—17 верасня 1939 года. Слаўная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія прынесла свабоду і шчасце народу, які прыгнятаўся польскімі панамі.

Цяжкім і беспрасветным было жыццё вясковай сялянкі ў былой Польшчы. Дарога да навукі ёй была закрыта. Сялянка не мела ніякіх правоў і знаходзілася ў поўным падпарадкаванні ў свайго мужа. Бяспраўную, забітую, непісьменную жанчыну не лічылі за чалавека.

У такое становішча была пастаўлена жанчына тагочасным буржуазным ладам былой панскай Польшчы. Непасільныя сельскагаспадарчыя падаткі, штрафы выціскалі апошнія сокі з сялянства. Беларуская вёска была асуджана на разарэнне. З кожным днём бяднеў селянін, не маючы грошай на пакупку хлеба, бялізны, вопраткі, абутку.

Я была ў многіх вёсках Заходняй Беларусі. Ні ў адной сялянскай хаце я не бачыла вопраткі, пашытай з фабрычнай тканіны. Каб прыкрыць схудалыя цельцы сваіх дзяцей і якнебудзь апрануцца сялянка вымушана была здабываць сабе вопратку хатнім спосабам.

Голад, нястачы, хваробы панавалі ў сялянскай хаце. Тысячы дзяцей паміралі з голаду. Калі ў сям'і з'яўляўся лішні рот, для селяніна ён быў вялікай абузай. Аднойчы да мяне звярнулася сялянка і кажа: «Я чакаю пятага дзіцяці,—яшчэ лішні жабрак. Дапамажы мне, дарагая, пазбавіцца ад яго. Мае чацвера дзяцей сядзяць голыя, галодныя, раздзетыя, не ходзяць у школу, бо няма абутку. Што мне рабіць?

Гора яе было вялікае, але выйсця з гэтага становішча не магла знайсці. Урачы не браліся без грошай рабіць аборта.

Бязвыхаднае становішча жанчыны, беспрасветнасць, панаваўшая ў вёсцы, азараліся весткамі аб Совецкім Саюзе. Поўнай верай і ўпэўненасцю ў лепшае будучае напаўняліся сэрцы абяздоленых народаў былой панскай Польшчы. Цяпер жанчына-сялянка з забітай, непісьменнай становіцца актыўным удзельнікам у грамадскім жыцці краіны.

Беласток. **М. А. Аўсеевіч**



Сотні рабочых сямей, якія пражываюць у Заходніх абласцях Беларусі, з сырых і цёмных падвалаў і хібарак пераселены ў былыя барскія асабнякі і новыя абсталяваныя кватэры.

На здымку: работніца прадзільнай фабрыкі Беластоцкага камбіната № 1 Я. І. Пехоўская ў новай кватэры, дзе раней жыў фабрыкант Сям'я тав. Пехоўскай атрымала разам з кватэрай і ўсю абстаноўку, у тым ліку і піяніна.

Фота Д. Чэрнова (Фотахроніка БЕЛТА)

У ордэнаносным калгасе

Вялікую славу набыў сабе калгас імені Валадарскага, Магілеўскай вобласці. У мінулым годзе ён удастоіўся высокай чэсці быў удзельнікам усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. Сотні тысяч людзей з вялікай цікавасцю аглядалі стэнды калгаса.

За выдатныя поспехі ў галіне павышэння ўраджайнасці ільна, зернавых, бульбы, за развіццё жывёлагадоўлі Галоўны выставачны камітэт прысудзіў калгасу дыплом першай ступені, прэмію 10.000 рублёў і легкавую аўтамашыну.

Высокая ацэнка ўрадам пладатворнай работы калгаснікаў акрыліла іх. Яны ўзялі абавязацельства ў гэтым годзе атрымаць яшчэ большыя ўраджаі па ўсіх культурах—у чым-бы та ні стала дабіцца права ўдзелу ва Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы 1940 года.

Радасць калгаснікаў павялічылася, калі яны даведаліся, што Совецкі Урад узнагародзіў іх калгас ордэнам Леніна. Маланкай абляцела гэта вестка ўсе дамы калгаснікаў. Калгаснікі моцна паціскалі друг другу рукі, віншавалі з высокай заслугай перад краінай.

Вялікі ўдзел у заваяванні Сталінскага ўраджаю прымалі жанчыны. Літаральна ва ўсіх працэсах работы жанчыны былі перадавымі людзьмі ў калгасе. Вось, напрыклад Ульяна Казлова шэсць год працуе даяркай на ферме. Увесь час паказвае ўзоры працы. У 1938 годзе яна атрымала па 1300 літраў малака ад кожнай каровы сваёй групы, а ў 1939 годзе ўжо атрымала ў сярэднім ад кожнай каровы па 2100 літраў малака.

Рабочы дзень Ульяны Казловай пачынаецца вельмі рана, прыкладна ў 7 гадзін раніцы ў зімовы час яе можна ўжо бачыць на ферме. Яна штодзённа чысціць грэбнем і шчоткай кароў, перад дойкай вымя кожнай каровы мые цёплай вадой.

Тав. Казлова спаборнічае з даяркай Жэняй Даражковай. У сваім дагаворы яна запісала: «Дабіцца ў 1940 годзе ад кожнай каровы 2500 літраў малака».

У канцылярыі калгаса часта можна бачыць звеннявых, брыгадзіраў, стаханаўцаў. Яны ўдумліва і дзелавіта абмяркоўваюць планы работы, планы пасеваў зернавых, ільну і бульбы. Звеннявыя па ільну тт. Ціткова і Мішакова часта раяцца з аграномам. У мінулым годзе яны атрымалі на сваіх паказальных участках па 8 цэнтнераў ільновалакна і па 5,2 цэнтнера ільнонасення з гектара.

Тав. Мішакова добра вывучыла агратэхніку ільна і, правільна прымяняючы яе, забяспечвае высокія ўраджаі ільновалакна. Яна—ініцыятар соцыялістычнага спаборніцтва ў калгасе.

Весела і шчасліва жывуць калгасніцы і калгаснікі ў ордэнаносным калгасе імені Валадарскага.

М. Папкоў.

Магілеў.

У Пінску пачалася выдача совецкіх пашпартоў.
На здымку: Работніца Пінскай сярэдняй школы тав. Міховіч О. А. атрымала совецкі пашпарт.

Фота Л. Мазэлева.



Група студэнтаў Віцебскага мастацкага вучылішча на практычных занятках. Злева направа: Фаня Лухвін, Валенціна Валодзька, Раіса Курэвіч, Александра Паслядовіч і Екацерына Табакова. Фота Б. Хеніна (Фотахроніка БЕЛТА)

АСВАЙВАЮЦЬ НОВЫЯ ПРАФЕСІІ

Зусім непісьменнай прышла я ў горад і стала працаваць на шкляным заводзе. За тры годы работы на заводзе я ліквідавала сваю непісьменнасць. Цяпер вучуся ў 5 класе вячэрняй школы без адрыва ад вытворчасці. У 1938 годзе паступіла на запалкавую фабрыку імені Кірава. Тут працавала на ўкладцы гільзавых канцоў.

Калі нашы браты і мужы падалі руку брацкай дапамогі прыгнечаным народам Заходняй Беларусі, жанчыны нашай фабрыкі рашылі адзначыць гэту гістарычную дату новымі вытворчымі перамогамі. Многія жанчыны перайшлі на работу, якая раней выконвалася выключна мужчынамі. На так званых «мужчынскіх» работах у нас цяпер на фабрыцы працуюць сотні жанчын.

Простыя работніцы сталі працаваць памочнікамі строгаляў і строгалямі. Работніца цэха Янучкоўская працавала памочнікам строгаля, цяпер яна працуе строгалем. Хутка асвоіла новы працэс на доначным станку, і штодзённа перавыконвае норму на 108—110 процантаў. Анна Шыкавец працуе памочнікам строгаля донак і выконвае норму на 140—150 процантаў.

Я таксама працую памочнікам строгаля. Гэта работа даволі складаная, але мы, жанчыны, хутка асвоілі яе і добра спраўляемся з работай.

На фабрыцы шырока разгарнуўся рух многастаночніц. Раней работніцы працавалі на адным—двух станках, цяпер яны працуюць на пяці-шасці станках кожная. Вось работніца каробачнага цэха Еўгенія Дзеравяга з чатырох станкоў пераключылася на абслугоўванне шасці станкоў. Марыя Ліхадзіеўская і Бабровіцкая працавалі на двух станках, цяпер працуюць на пяці станках кожная. Усе яны даюць прадукцыю добрай якасці.

Сотні і тысячы совецкіх жанчын працуюць на адказных кіруючых работах. Ні ў адной капіталістычнай краіне жанчына не карыстаецца такім роўнапраўем, як жанчына Совецкага Саюза.

Ніна Макрыцкая.

Барысаў.

Трактарыстка Яноўская

З поля даносілася вясёлая песня калгасніц. Надзя на мінуту спынілася. Яе позірк быў прыкаван да трактароў, выходзіўшых у поле.

Надзя не заўважыла, як да яе падышоў старшыня калгаса.

— Любуецеся т. Яноўская. Ці не жадаеце самі кіраваць гэтай машынай.

— Трактар—гэта мая мара, тав. старшыня,—крыху хвалюючыся адказала Надзя.—Але не змагу...

— Чаму вы так думаеце. Пашлём вас на курсы, падвучыцеся. А вучыцца жадаеце?

— Безумоўна,—адказала Надзя.

Назаўтра на агульным сходзе калгаснікаў калгаса «Першае мая» аднадушна была вылучана Яноўская на курсы трактарыстаў.

Шэсць месяцаў вучылася Надзя на курсах, а па сканчэнні іх прыехала ў Еўчанскую МТС і з новымі сіламі ўзялася за работу.

... Тав. Яноўская старанна праверыла свой трактар. На поле прыехала першай, а праз некалькі мінут загудзеў матор трактара,—ён вышаў араць шырокае калгаснае поле.

Праходзілі дні. І як заўсёды Надзя Яноўская выязджала на поле першай на сваім любімым трактары. У рабоце яна паказала сябе сапраўдным барацьбітом за высокі сталінскі ўраджай, стаханаўкай. Дзённую норму выпрацоўкі перавыконвала.

У вялікім памяшканні праходзіў многалюдны сход калгаснікаў калгаса «Першае мая». Першым выступіў старшыня калгаса. Ён адзначыў выдатную работу трактарысткі Надзі Яноўскай і тут-жа ўручыў ёй прэмію—веламашыну.

І яна дала слова яшчэ лепш працаваць—гэта яе самая лепшая падзяка за прэмію.

Зараз Надзя Яноўская ўпарта змагаецца за заваяванне ганаровага права быць удзельніцай Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі 1940 года.

Г. Каплан.

Камарын.

ПАДРЫХТАВАЛІСЯ ДА СЯЎБЫ

Калгас «Шлях да соцыялізма», Горкаўскага сельсовета, добра падрыхтаваўся да веснавой сяўбы. На адным з агульных сходаў калгаснікі абмеркавалі зварот перадавікоў сельскай гаспадаркі БССР і ўключыліся ў соцыялістычнае спаборніцтва за атрыманне 100-пудовага ўраджая зернавых з гектара. Яны абавязаліся дабіцца не менш 170 цэнтнераў бульбы, 5 цэнтнераў ільновалакна з кожнага гектара ўсёй пасеўнай плошчы.

Каб выканаць гэтыя абавязацельствы брыгады і звенні калгаса заключылі дагаворы на соцыялістычнае спаборніцтва. Сам калгас «Шлях да соцыялізма» спаборнічае з калгасам імені Сталіна, гэтага-ж сельсовета.

Насенныя фонды поўнасцю ўжо ачышчаны і засыпаны. Зараз ідзе праверка насення на ўсхожасць. Сельскагаспадарчы інвентар адрамантаван, дзве радковыя сеялкі таксама адрамантаваны.

Калгас скарыстоўвае ўсе віды ўгнаення. У мінулым годзе ён загатовіў 500 тон торфу. Са станцыі Верамейкі вывезена 15 тон мінеральных угнаенняў. Сабрана ўжо 10 тон попелу, 4 цэнтнеры памёту. На поле вывезена 80 тон гною.

В. Агінскі.

Чэрыкаўскі раён.

Куток рабочай сталоўкі на тэкстыльнай фабрыцы № 7—9 у горадзе Беластоку.
Фота Д. Чэрнова
(Фотахроніка БЕЛТА)

Торфмейсцер тав. Коршук С. П. выканала план па ўнясенню торфа для ўгнаення калгасных палёў за 1939 год на 135 проц.
Фота Я. Салавейчыка.

СТАНУ ІНЖЫНЕРАМ

1940 год будзе самы знамянальны ў маім жыцці. У гэтым годзе я атрымаю званне інжынера-гідратэхніка. Гэтая спецыяльнасць дасць мне магчымасць працаваць ва многіх галінах нашага соцыялістычнага будаўніцтва: па меліярацыі зямель, на гідра-тэхнічных будаўніцтвах, па водаснабжэнню і інш. Усе гэтыя віды работ аднолькава цікавы для мяне і я з вялікім інтарэсам буду працаваць у любой галіне.

На працягу вучобы ў інстытуце я мела выдатную паспяховасць, выконвала рад грамадскіх нагрузак і актыўна ўдзельнічала ў абаронна-фізкультурнай рабоце. Радасна і весела прайшоў час вучобы ў інстытуце. Мае мары на будучае таксама радасныя. Я мару абараніць дыплом на «выдатна», і пайсці працаваць на вытворчасць упаўне падрыхтаванай.

Буду працаваць на вытворчасці і прымаць актыўны ўдзел у грамадскай і ваенна-фізкультурнай рабоце з тым, каб у любы момант быць гатовай да абароны радзімы.

Васса Шэбеко—
студэнтка 5 курса Політэхнічнага інстытута

Мінск.

ЕФРЭМАЎСКАЕ ЗВЯНО

Сцепаніда Сцяпанаўна Мяснікова працуе звеннявой паільну ўжо некалькі год. За гэты перыяд яна набыла вялікі вопыт работы па атрыманню высокага ўраджаю. У 1938 годзе звяно Мясніковай атрымала па 8 цэнтнераў ільновалакна і 8 цэнтнераў ільнонасення з гектара.

За высокія паказчыкі па ільну ў 1939 годзе тав. Мяснікова была ўдзельніцай Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. Выстаўка яшчэ больш узбагаціла і папоўніла яе багаты вопыт па павышэнні ўраджайнасці. Зараз звяно Сцепаніды Сцяпанаўны з'яўляецца ефрэмаўскім. Яно поўнасцю падрыхтавалася да веснавой сяўбы.

Дзякуючы добрасумленнай рабоце тав. Мясніковай калгас «Новае жыццё», Чашніцкага раёна, штогод план здачы ільновалакна дзяржаве не толькі выконвае, але і перавыконвае. Вось у мінулым годзе план выканалі на 205 процантаў. За лён зданы дзяржаве звыш плана калгас атрымаў 12 тысяч рублёў прэміі-надбаўкі.

Камінскі.

Чашнікі.

ПАРАДЫ ЎРАЧА

РЭЎМАТЫЗМ У ДЗЯЦЕЙ

Пад назвай рэўматызм шырокія слаі насельніцтва часта разумеюць захворванне суставаў вострае і хранічнае, калі хворы скардзіцца на вялікія болі ў суставах. Даказана аднак, што рэўматызм гэта не толькі паражэнне суставаў і не ўсе хваравітыя з'явы адносяцца да рэўматызма. Самая частая і самая небяспечная форма рэўматычнага захворвання адносіцца да паражэння сэрца.

Многія бацькі, ведаючы, што ў дзіцяці парок сэрца, лічаць гэта непапраўным недахопам, але ўсё-ж думаюць, што хвароба гэта нічым яму не пагражае. Між тым многім невядома, што большасць сардэчных парокаў з'яўляецца рэзультатам рэцыдывіруючага (паўтараючагася) у выглядзе прыступаў рэўматычнага захворвання сэрца. Чым часцей і чым вастрэй паўтараюцца гэтыя рэўматычныя прыступы, тым горш для дзіцяці.

Даказана, што рэўматызм з'яўляецца інфекцыйным захворваннем, аднак ад чалавека да чалавека ён не перадаецца. Некаторыя вучоныя лічаць, што стрэптакок—гэта той асобны мікроб, які заўсёды знаходзіцца ў чалавечым арганізме, часцей за ўсё ў поласці роту, гнілых сапсаваных зубах, у рыхлых павялічаных міндалінах. Па думцы гэтых вучоных стрэптакок пад уплывам інфекцыйных і другіх захворванняў, як грып, ангіна, дызентэрыя, шкарлятына, можа стаць хваравітым і выклікаць рэўматызм.

Ахаладжэнне цела дзіцяці робіць яго схільным да рэўматычнага захворвання.

Прафесар Кісель і другія вучоныя дзіцячыя ўрачы лічаць, што рэўматызм з'яўляецца спадчынай, што дзеці рэўматыкаў схільны да захворвання рэўматызмам.

Рэўматызмам захворваюць галоўным чынам у маладым узросце 16—25 год. Дзеці-школьнікі малодшага і старэйшага ўзроста хварэюць рэўматызмам вельмі часта,—2,5 да 3 процантаў. Дзеці школьнага ўзросту захворваюць рэўматызмам ва ўсіх яго формах. У Англіі ад хваробы сэрца пры рэўматызме штогодна гіне 12—15 тысяч дзяцей. Такім чынам мы бачым, якое вялікае значэнне мае гэта хвароба ў дзіцячым узросце і як небяспечна яна для дзяцей.

Даўно ўжо адзначалі сувязь ангіны з рэўматызмам. Ангіна часта прадшэствуе захворванню рэўматызмам. Таму дзіця, перахварэўшае цяжкай ангінай ці часта хварэючае ёю, павінна заўсёды выклікаць апасенні з боку оацькоў, каб гэта ангіна не дала рэўматызма. Ва ўсіх такіх выпадках трэба звярнуцца да ўрача і зрабіць лабараторнае даследванне крыві на рэакцыю асядання эрытрацытаў. Паскарэнне гэтай рэакцыі патрабуе асабліва ўважлівых адносін да хворага дзіцяці і асцярожнасць у сэнсе звароту яго да звычайных заняткаў.

Востры прыступ рэўматызма з паражэннем суставаў звычайна працякае з павышанай тэмпературай і агульным недамаганнем. Звычайна на працягу першых сутак ужо з'яўляецца вострая боль з боку якога-небудзь сустава. Гэты сустаў распухае, скура злёгку чырванее ў выніку накаплення вадкасці ўнутры суставной сумкі і вострай болі, спыняецца рух у суставе. Паступова васпаліцельны працэс захоплівае і другія суставы, большай часткай аднайменныя. Перш за ўсё захворваюць каленныя суставы, потым галенастопныя, тазабедраныя і суставы рук. Тэмпература даходзіць у разгары хваробы да 39—40 градусаў. Малейшы рух і датыканне да суставаў хворага выклікаюць пакутлівыя болі.

У гэты-ж час ці трошкі пазней адбываецца васпаліцельны працэс у мышцах сэрца, у злучальнай тканіне ўнутранай ці павярхоўнай абалонкі сэрца, на клапанах сэрца. Тэмпература застаецца павышанай, часта бывае з уздымам і падзеннем у розныя гадзіны дня. Хворы слабее. У яго часты пульс і адышка пры напружаннях, часамі хворы скардзіцца на болі ў сэрцы. Пасля гэтага абвастрэння хваробы сэрца застаецца з якім-небудзь дэфектам, які перашкаджае нармальнай яго рабоце. Сэрца інвалідзізіруецца—узнікае парок сэрца.

Вучонымі ўстаноўлена, што ад моманта ўзнікнення васпаліцельнага працэса ў тканінах сэрца да моманта поўнага заціхання гэтага працэса і замяшчэння паражонай тканіны рубцом праходзіць некалькі месяцаў.

У гэты перыяд часу сэрца патрабуе да сябе асаблівай увагі, інакш маецца пагроза новага прыступа з пагоршаннем становішча паражонага сэрца.

Бацькі павінны ведаць, што як толькі праходзіць востры перыяд хваробы, дзіця імкнецца ўстаць з ложка, пабегаць, між тым, як небяспека ў гэтым перыядзе асабліва вялікая.

Вытрымка ў ложку, асцярожнасць, шанаванне слабага сэрца, вось што патрабуецца ад бацькоў у адносінах да свайго хворага дзіцяці.

Рэўматызм звычайна лечаць саліцылавымі прэпаратамі ў выглядзе парашкоў, таблетак, дзецям лепш прызначаць іх у мікстуры. Мясцова ўжываецца цяпло, светлавыя ванны, сіні свет і другія фізіятэрапеўтычныя працэдуры. Пасцельны рэжым, рэжым чыстага паветра і поўнакаштоўнага, багатага вітамінамі харчавання—асноўныя метады лячэння рэўматычна паражонага сэрца. Асабліва каштоўным з'яўляецца вітамін С. Зразумела, што прыходзіцца ўжываць сардэчныя сродкі.

Совецкі ўрад адпускае велізарныя сродкі на барацьбу з рэўматызмам. Большасць нашых клінік і больніц маюць палаты і ложкі для дзяцей, якія хварэюць рэўматызмам.

У БССР ёсць спецыяльная ўсебеларуская дзіцячая здраўніца—санаторый у Горвале, Рэчыцкага раёна, куды накіроўваюцца дзеці, перахварэўшыя вострымі прыступамі розных форм рэўматызма, дзеці з рэўматызмам сэрца для адпачынку і лячэння.

Бацькі, рэўматызм у дзяцей небяспечнае захворванне. У большасці выпадкаў паражаецца важны і каштоўны для жыцця орган—сэрца. Патрэбна берагчы сэрца, своечасова зварочвацца да ўрача, накіроўваць дзіця ў больніцу, прымаць усе меры лячэння і прафілактыкі, указаныя ўрачом.

Урач З. С. Левін.

Эжен Потье

18 МАРТА 1871 ГОДА

* * *

Тесней, товарищи, сомкнем
Свои ряды в союз единый—
И, в день великой годовщины,
Коммуне славу воспоем!

В тот день, в день схваток боевых,
Мы прорывали все засады—
И помнят камни мостовых,
Как здесь гремели баррикады.

Такой бушующий поток
Еще в истории неведом:
То был невиданный пролог
К грядущим битвам и победам.

«На штаб предателей, на бой!»
Взывали в гневе коммунары.
И вот восставшей голытьбой
Отбиты пушки в битве ярой.

Вся банда трусов, палачей
Вдруг скрылась под ночным
покровом,
Париж срывает гнет цепей
И миру—мир готовит новый.

Тот день был днем безвестных лиц,
Людей без имени и рода,
Рабочих с волей без границ,
Вождей-бойцов из недр народа.

То был день радостных побед,
Когда, восстав, бойцы из стали
Чрез свой центральный комитет
Владыкам волю диктовали.

Толпами к ратуше летя,
В рабочих блузах, весь сияя,
Париж ликует, как дитя,
Коммуны день провозглашая...

И возвещается пальбой
Последний день буржуазии,
И радость рвется, как прибой
Разбушевавшейся стихии...

То было в утро вешних дней,
Когда ликует все живое.
В сияньи солнечных лучей
Блистало знамя боевое.

Простой лоскут, что нес народ,
Горел, как золото, сверкая,
Бросая пламя в небосвод,
К шахтерам в бездны проникая...

Тесней, товарищи, сомкнем
Свои ряды в союз единый—
И, в день великой годовщины,
Коммуне славу воспоем!

Адказны рэдактар Г. В. КАГАН.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Совецкая, 49, 1 паверх.

Друкарня імя Сталіна. Зак № 2238 Тыраж 8550 экз. Уп. Галоўліта БССР № 134.
Ўдана ў друк. 7/III—40 г. Падпісана да друку 25/III—40 г. У нумары 2½ друк. арк. 120.140 друк. знак.

Цана 20 кап.